


DEATH OF THE FAMILY

BATMAN

14 | $3.99 US

SCOTT SNYDER
GREG CAPULLO
JONATHAN GLAPION

THE NEW 52!



BY COMICS

БЭТМЭН #14 (2011)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY



DEATH OF THE FAMILY

BATMAN®

14 | $3.99 US

SCOTT SNYDER
GREG CAPULLO
JONATHAN GLAPION

THE NEW 52!


BY COMICS

БЭТМЭН #14 (2011)
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY

JOE'S GARAGE

Capullo 12 +fco

Die



DC Comics прадстаўляе Бэтмэна ў

DEATH OF THE FAMILY

ПАЧУЦЦЁ ГУМАРУ

ДЗЕ ДЖОКЕР, ХАРЛІ?!
ХАРЛІ!

Скот Снайдэр - сцэнар

ЁН УШОЎ, БЭТС, УШОЎ...
АДНАК, МАГЧЫМА... МАГЧЫМА, ТЫ БУДЗЕШ НАСТУПНЫМ... Я ЗАЎСЁДЫ ТАК ЛІЧЫЛА. МАГЧЫМА, ТЫ ВЕРНЕШСЯ ТАКІМ, ЯКІМ ЁН БЫЎ КАЛІСЬЦІ...

Грэг Капула - малюнак

...ПРЫГОЖЫМ.

Джонатан Глапіён - чарніла

ХАРЛІ! НЯМА ЧАСУ!

Франсіска Плаценсія - колер

ТЫ ПАВІННА АДЧЫНІЦЬ ГЭТА, ЗАРАЗ ЖА!
ЗАРАЗ ЖА!

Рычард Старкінгс і Джымі Бетанкорт (Комікрафт) - шрыфт



Купула і Плаценсія - вокладка



Трэвар МакКарці - другая вокладка



Кэці Куберт - ас. рэдактара
Майк Мартс - рэдактар

Я ШУКАЮ НЕШТА, ШТО Я ВЫПУСЦІЎ, НЕЙКІ ТАЯМНІЧЫ ІНГРЭДЫЕНТ, ЯКІ ЯГО СПАРАДЗІЎ.

Я ГЛЯЖУ НА ЯГО ДА ПАМУТНЕННЯ Ў ВАЧАХ, ГЛЯЖУ Ў НІКУДЫ, НА СЯБЕ, НА СВАЕ ВОЧЫ, ЯКІЯ АДЛЮСТРАВАНЫ Ў ЛІНЗАХ.



Бэтмэн створаны Бобам Кейнам

НЕШТА, ШТО НІХТО НЕ ПАВІНЕН ЗМАГЧЫ ПЕРАЖЫЦЬ...

ЗВЯК

УХ!

ПОШУК ЦЕПЛАВЫХ СЛЯДОЎ.

ПОШУК НЕМАГЧЫМА. АЦЭНКА ПАШКОДЖАННЯЎ... НЕПАПРАЎНА.

НЕПАПРАЎНА.





САЮЗНІКІ, БУДЗЬЦЕ Ў ПОЎНАЙ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЦІ. ДЖОКЕР МОЖА ЦЭЛІЦЬ У ВАС ПА-АСОБКУ. ПАЎТАРАЮ: БУДЗЬЦЕ Ў ПОЎНАЙ БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЦІ.










АЛЬФРЭД?


АЛЬФРЭД, ТЫ ТУТ?
СКРИП


АЛЬФРЭД?
СКРИП


СКРИИП
НЕ...








ПРЫВІТАННЕ, БРУСІК!

СПАДЗЯЮСЯ, ТЫ НЕ ПАКРЫЎДЗІШСЯ НА МЯНЕ ЗА ТОЕ, ШТО Я ПАЗЫЧЫЎ ТВАЙГО ПРЫСЛУЖНІКА. Я ПЛАНУЮ НЕШТА ВЕЛЬМІ НЕЗВЫЧАЙНАЕ. СВЯТА ДЛЯ ТЫ-САМ-ВЕДАЕШ-КАГО, І Я ЧУЎ, ЁН САМЫ ЛЕПШЫ.

МАЙСТАР БРУС, ВЫБАЧАЙ-ЦЕ МЯНЕ! ГЭТЫ ВЫРАДЛІВЫ...

ШШШШШШШШШШ, ДЖЫВЗ*...

КАЛІ ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ШТО ЗАВЯЗАЎШЫ МНЕ ВОЧЫ, ВЫ ЗАПУЖАЕЦЕ МЯНЕ...

ХАХАХА! ЛІЧЫШ, ТЫ... ХАХАХА! ТВАЕ ВОЧЫ НЕ ЗАВЯЗАНЫЯ, ДОБРЫ СЭР.

*БЕЗДАКОРНЫ КАМЕРДЫНЕР З ТВОРАЎ ВУДХАЎСА

АЛЕ...

Я СПАЛІЎ ТВАЕ ВОЧЫ АМОНІЕМ.

ВОСЬ, Я ЗРАБЛЮ ГЭТА ЯШЧЭ РАЗ, ДЗЕЛЯ ЖАРТА!

АААААЙЙЙЙЙ!

ХАХАХА!




ДЖЫМ.



...


ПРАБАЧ.
БЭТМЭН, УВАХОДЗЬ. ШТО Ў ЦЯБЕ?


МІНУЛАЙ НОЧЧУ ДЖОКЕР ВЫКРАЎ ПРЫСЛУЖНІКА БРУСА ЎЭЙНА.
ТАКСАМА ЁН СКАЗАЎ, ШТО ПЛАНУЕ НЕШТА... СВЯТА, І ШТО ЯМУ ПАТРЭБНЫ НЕХТА, КАБ ДАПАМАГЧЫ Ў АБСЛУГОЎВАННІ.


АЛЬФРЭД ПЕНІВОРТ... ЗДАЕЦЦА, НА ГЭТЫ РАЗ НІХТО НЕ Ў НЕБЯСПЕЦЫ. КАНЕШНЕ, НЕ ТОЕ, КАБ НЕХТА КАЛІСЬЦІ БЫЎ У НЕБЯСПЕЦЫ...
НЕ.



ВОСЬ ШТО Я БОЛЬШ ЗА ЎСЁ НЕНАВІЖУ Ў ГЭТЫМ ВАР'ЯЦЕ. З УСІМІ АСТАТНІМІ ЁСЦЬ ХОЦЬ НЕЙКАЕ ПАЧУЦЦЁ ЛОГІКІ, НЕЙКІ МАТЫЎ, ЯКІ НАДАЕ СЭНС.
НАВАТ У ЗАЎСЁДНІКАЎ АРКХЭМА, РЫДЛЕРА, ФРЫЗА...


...КАЛІ ТЫ ДАСТАТКОВА ДОБРЫ ДЭТЭКТЫЎ, У ЦЯБЕ ЁСЦЬ НЕЙКАЕ ЎЯЎЛЕННЕ ПРА ТОЕ, ЯКІМ МОЖА БЫЦЬ ІХ НАСТУПНЫ КРОК. АЛЕ ГЭТАМУ ЗЛОДЗЕЮ ТЫ МОЖАШ ТОЛЬКІ АДКАЗВАЦЬ... ГЛЯДЗЕЦЬ, ХТО СТАНЕ ЯГО НАСТУПНАЙ АХВЯРАЙ.
БОГ У ДАПАМОГУ ТАМУ, ХТО МОЖА ДУМАЦЬ, ЯК ЁН.
ДЖЫМ... ВОСЬ ЧАМУ Я ТУТ.


НАСТУПНАЯ АХВЯРА – ТЫ.


ГОРДАН
НЕ ІСНУЕ КАМПАНІІ З НАЗВАЙ «ГОРДАН», ЯКАЯ МАЕ НЕЙКАЕ ДАЧЫНЕННЕ ДА ЗАПІСАЎ МАТЭРЫЯЛАЎ. ЛЭЙБЛ ЗРОБЛЕНЫ ПА ЗАКАЗУ. НА ЁЙ НЯМА НІЯКІХ ДОКАЗАЎ, АКРАМЯ САМАГО ІМЯ.
Я ЗАБЯРУ ЦЯБЕ Ў БУНКЕР, ЯКІ Ў МЯНЕ ЁСЦЬ, ДЖЫМ.



ХРЭНА ЛЫСАГА. Я ПАЙДУ З ТАБОЙ У НЕЙКАЕ ТАМ БЭТСХОВІШЧА, ТОЛЬКІ КАЛІ ТЫ...
ПРОСТА ІДЗІ, ДЖЫМ.
НЕ.

НЕ, ЧОРТ БЯРЫ! НЕ! Я НЕ ПАКІНУ СВАІХ ЛЮДЗЕЙ. Я НЕ ЗБІРАЮСЯ ХАВАЦЦА, ПАКУЛЬ ЯНЫ ТУТ НА ЛІНІІ ФРОНТА.
ТОЛЬКІ НЕ ПАСЛЯ ТАГО, ШТО ЁН ЗРАБІЎ З НАМІ! ДЗЕВЯТНАЦЦАЦЬ ЗАБІТЫХ, БЭТМЭН. ДЗЕВЯТНАЦЦАЦЬ НА МАІМ СУМЛЕННІ. НЕ РАБІ ГЭТАГА. НЕ ЗАБІРАЙ МЯНЕ.

ТЫ ВЕДАЕШ ГЭТА ТАК ЖА ДОБРА, ЯК Я. АДЗІНЫ СПОСАБ ЯГО ПЕРАМАГЧЫ – ГЭТА НЕ БАЯЦЦА. МНЕ ТРЭБА СУСТРЭЦЦА З ІМ...

...НАВАТ КАЛІ ДЛЯ ГЭТАГА ТРЭБА ПАБЯРЭДЗІЦЬ СТАРЫЯ РАНЫ. САМЫЯ БАЛЮЧЫЯ...
..САМЫЯ...

ДЖЫМ?
ТРЫМАЙСЯ, ДЖЫМ, УСЁ БУДЗЕ ДОБРА!





«ЯК ЁН, БЭТМЭН?»


ЁН ЗГУБІЎ ШМАТ КРЫВІ. Я ДАЎ ЯМУ КААГУЛЯНТ, КАБ У ЧАС СПЫНІЦЬ КРОВАЦЯЧЭННЕ, АЛЕ РАЗЖЫЖВАЮЧАЕ РЭЧЫВА, ЯКОЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЛ ДЖОКЕР, ВЫТВОРАНА АД ГЕПАРЫНА.


ПРЫКРАЯ ШТУКА.
НА ШЧАСЦ, ЗАРАЗ СТАН ДЖЫМА СТАБІЛЬНЫ. З ІМ УСЁ ПАВІННА БЫЦЬ У ПАРАДКУ.
Я АТРЫМАЎ ТВАЁ ПАВЕДАМЛЕННЕ. ДЖОКЕР ПАЛЮЕ НА ЎСІХ НАС У ГЭТЫ РАЗ, ТАК? ТАК? СЯМЕЙНЫЯ СПРАВЫ.


ЁН ТАК СКАЗАЎ.
І КАМІСАР ГОРДАН – ПЕРШЫ Ў СПІСЕ...
НАЙТВІНГ, РАНЕЙ ГЭТЫМ ДНЁМ ДЖОКЕР... ЁН ЗАБРАЎ ПРЫСЛУЖ-НІКА БРУСА ЎЭЙНА.


...
АЛЬФРЭДА?


ШТО АЗНАЧАЕ «ЗАБРАЎ АЛЬФРЭДА»? АДКУЛЬ? ЯК?
ВІДАЦЬ, ДЖОКЕР ПАДВАБІЎ ЯГО ДА ПАРАДНЫХ ДЗВЯРЭЙ МАЁНТКА ЎЭЙНАЎ І ВЫКРАЎ.
Я БАЧЫЎ ЗАПІСЫ СІСТЭМЫ БЯСПЕКІ. МНЕ НЯМА ЗА ШТО ЎЧАПІЦЦА. ФУРГОН, ЯКІ ЁН ВЫКАРЫСТОЎВАЎ, НЕ АПАЗНАЦЬ. ТО Е Ж З МАЛАТ-КОМ, ЯКІМ ЁН СТУКНУЎ ПЕНІВОРТА.


МАЛАТКОМ?! БОЖА МОЙ. ШТО МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ?
КАЛІ ПЕНІВОРТ...
МОЖАШ ПЕРАСТАЦЬ КАЗАЦЬ КОДАВЫМІ ІМЁНАМІ, КАЛІ ЛАСКА? ТУТ НІКОГА НЯМА! МЫ КАЖАМ ПРА АЛЬФРЭДА.
БОЖА, ТЫ МЕНАВІТА ТАМУ ХАЦЕЎ ПАГАВАРЫЦЬ ПРА ГЭТА ТУТ, ВА ЎСІХ НАВІДАВОКУ, КАБ НАМ ПРЫЙШЛОСЯ КАЗАЦЬ ШЫФРАМІ? ДЫК ТАБЕ НЕ ПРЫЙДЗЕЦЦА МЕЦЬ СПРАВУ З...
ЛІЧЫШ, МНЕ ЛЁГКА, ДЗІК?! ГЭТЫ ЧАЛАВЕК ВЫГАДАВАЎ МЯНЕ. ЁН БЫЎ МНЕ БАЦЬКАМ СТОЛЬКІ, КОЛЬКІ Я ПАМЯТАЮ. І ЗАРАЗ ЁН У ГЭТАГА ВАР'ЯТА.
Я ПАПРАСІЎ СУСТРЭЦЦА ТУТ, КАБ ЗБЕРАГЧЫ ЧАС! З КОЖНАЙ ХВІЛІНАЙ, ЯКУЮ МЫ СТРАЧВАЕМ, З КОЖНАЙ СЕКУНДАЙ, АЛЬФРЭД ВА ЎСЁ БОЛЬШАЙ НЕБЯСПЕЦЫ. НЕ ХОЧАШ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ШЫФР, ДОБРА, МНЕ ТАК САМА ПЛЯВАЦЬ НА ШЫФРЫ.


ПРАБАЧ, БРУС. ПРОСТА ГЭТА... ГЭТА АЛЬФРЭД.
ВЕДАЮ. ВОСЬ ЧАМУ Я ВЫРАШЫЎ НЕ КАЗАЦЬ ПРА ГЭТА АСТАТНІМ ЧАЛЬЦАМ СЯМ'І. ПАКУЛЬ.


ШТО?
КАЛІ ЯНЫ ПАЧУЮЦЬ, ШТО АЛЬФРЭД ЗНІК, ТАДЫ ЗАХАЦЯЦЬ УЗМАЦНІЦЬ ПОШУКІ ДЖОКЕРА.


КАНЕШНЕ, ЗАХАЦЯЦЬ. І...
І ДАЗВОЛЯЦЬ СВАІМ ПАЧУЦЦЯМ УЗЯЦЬ УЛАДУ НАД САБОЙ.


ЯНЫ ПАЙДУЦЬ ЗА ІМ, І Ў ЯГО БУДЗЕ ПЕРАВАГА, БО ЯНЫ НЕ БУДУЦЬ СЯБЕ КАНТРАЛЯВАЦЬ. ЁН УЖО СКАЗАЎ ГЭТА, ЁН ТАКСАМА ПАЛЮЕ І НА ІХ. І НА ЦЯБЕ.
АДКУЛЬ ТАБЕ ВЕДАЦЬ, ШТО ЯНЫ НЕ ЗМОГУЦЬ УЗЯЦЬ СЯБЕ Ў РУКІ?
МНЕ САМОМУ ЦЯЖКА СТРЫМЛІВАЦЦА, ДЗІК! І Я НЕ МАГУ РЫЗЫКАВАЦЬ. Я ПРАШУ ЦЯБЕ ПАКУЛЬ ТРЫМАЦЬ ГЭТА ПРЫ САБЕ. Я ПРАШУ ЦЯБЕ ДАПАМАГЧЫ МНЕ АБАРАНІЦЬ ІХ.

«ЛІЧЫШ, ШТО КАЛІ ЁН ЗАБРАЎ АЛЬФРЭДА...»

«...ЛІЧЫШ, ДЖОКЕР ВЕДАЕ»?

«НЕ. Я ТАК НЕ ДУМАЮ. ЁН ПАКІНУЎ ЦЫДУЛКУ БУРСУ ЎЭЙНУ. ДЖОКЕР СКАЗАЎ, ЯМУ ПАТРЭБНЫ НЕХТА, ПРЫСЛУЖНІК, КАБ ТОЙ ДАПАМОГ ЯМУ ПАДРЫХТАВАЦЬ НЕШТА».

АЛЬФРЭД ДОБРА ВЯДОМЫ ЯК МОЙ ПРЫСЛУЖНІК... АСАБЛІВА З ТОГА ЧАСУ, ЯК МЫ ПАЧАЛІ ГОТЭМСКУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ. ДА ТАГО Ж БРУС ЎЭЙН ЗЛУЧАНЫ З БЭТМЭН ІНКАРПАРЭЙТЭД, І КАЛІ ДЖОКЕРУ СПАТРЭБІЦЦА НЕХТА Ў ЯКАСЦІ ПРЫСЛУЖНІКА, АЛЬФРЭД БУДЗЕ ПЕРШЫМ, ЗА КІМ ЁН ПРЫЙДЗЕ.

ТЫ САПРАЎДЫ ЛІЧЫШ, ШТО ГЭТА ЎСЁ? НІЧОГА АКРАМЯ СУВЯЗІ З КАРПАРАЦЫЯЙ?

ТАК.

БРУС, ТЫ САПРАЎДЫ ЎСЁ МНЕ РАСКАЗВАЕШ?

...Я ВЕДАЮ, ЯКІМ БУДЗЕ ЯГО НАСТУПНЫ КРОК. ДЖОКЕРА.

ДЫК ЧАМУ Ж ТЫ МАЎЧЫШ? НАПЕРАД.

НЕ. Я ІДУ АДЗІН.

ХРЭНА ЛЫСАГА. КАЛІ ТЫ ДУМАЕШ...

«МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ ПАЙШОЎ ДА АКВЕДУКА, ДЗІК. ЁН ПРАЙГРАВАЕ СВАЕ ЗЛАЧЫНСТВЫ».

ЁН ВЫБІРАЕ НАШЫЯ РАНЕЙШЫЯ СУТЫЧКІ, ПАЎТАРАЮЧЫ ІХ, АЛЕ ПА-НОВАМУ. ПЕРАРАБ-ЛЯЮЧЫ ІХ».

«ЛІЧЫШ, ЁН ЗБІРАЕЦЦА АТРУЦІЦЬ ВОДАСХОВІШЧА?»

«НЯ ВЕДАЮ, АЛЕ ТЫ МНЕ ПАТРЭБНЫ Ў ТРУБАПРАВОДА»

«АДКУЛЬ ТЫ ВЕДАЕШ, ШТО ЁН БУДЗЕ Ў ВОДАСХОВІШЧА?»

«БО ВЕДАЮ, ПАЗВАНІ, КАЛІ БУДЗЕШ НА МЕСЦЫ»,

«ДОБРА, ТОЛЬКІ БУДЗЬ АСЦЯ-РОЖНЫ...»

НЕ ДУМАЙ ПРА ГЭТА, БРУС.

НЕ ДУМАЙ ПРА ТОЕ, ЯК ЦІХА НА ДАРОЗЕ ГЭТАЙ НОЧЧУ. ЦІХА, БО ПРАМА ЗАРАЗ ТЫ ПАВІНЕН БЫЎ РАЗМАЎЛЯЦЬ З АЛЬФРЭДАМ. ТЫ ЗАЎСЁДЫ ТЭЛЕФАНУЕШ ЯМУ Ў ГЭТЫ ЧАС, НА ШЛЯХУ ПЕРАД БОЙКАЙ.

КАЛІ Б ТЫ ЎСЁ Ж НЕ ДАЗВОЛІЎ ДЖОКЕРУ СХАПІЦЬ ЯГО, ТЫ Б ТЭЛЕФАНАВАЎ ЯМУ, КАБ РАСКАЗАЦЬ ДЭТАЛІ СПРАВЫ, УПЭЎНІЦЬ, ШТО З ТАБОЙ УСЁ БУДЗЕ ДОБРА.

АЛЕ Ў САПРАЎДНАСЦІ ГЭТА НЕ ТАК. НЕ, ТЫ Б СКАЗАЎ САБЕ, ШТО ПРЫЧЫНА НЕ Ў ГЭТЫМ.

АЛЕ ГЛЫБОКА ЎНУТРЫ ТЫ Б ВЕДАЎ, ШТО ЗВАНІШ, КАБ ПАЧУЦЬ ЯГО ГОЛАС. КАБ БЫЦЬ УПЭЎ...

ДОСЫЦЬ.

ЗАСЯРОДЗЬСЯ НА СПРАВЕ. РАЗЖЫЖАЛЬНІК КРЫВІ, ЯКІ ДЖОКЕР ВЫКАРЫСТАЎ СУПРАЦЬ ГОРДАНА, КАМПАНІЯ, ЯКАЯ ЯГО ВЫРАБЛЯЕ, ТАКСАМА ПРАДАСТАЎЛЯЕ ХІМІКАТЫ, ЯКІМІ МОЖНА АПРАЦАВАЦЬ ВОДАСХОВІШЧА.

І ВОДАСХОВІШЧА БЫЛО МЕСЦАМ ТВАЁЙ ПЕРШАЙ БОЙКІ З ДЖОКЕРА ТВАР У ТВАР, ТВАЯ ПЕРШАЯ САПРАЎДНАЯ БОЙКА З ІМ.

ТУТ ТЫ ЎПЕРШЫНЮ ЎБАЧЫЎ ЯГО, УБАЧЫЎ ПА-САПРАЎДНАМУ, ТАГО, ХТО ЁН. ТУТ ТЫ ЗРАЗУМЕЎ, З ЧЫМ СУТЫКАЕШСЯ Ў ЯГО АСОБЕ.

І ТУТ ЁЕ ЎБАЧЫЎ, ЯК ТЫ АДЫХОДЗІШ.


ВІТАЮ, РОДНЫ.


ДЗЕ ПЕНІВОРТ?


ШТО, НЕ АБДЫМЕШ? НЕ ПАЦАЛУУУУЕШ? НАВАТ НЕ КІНЕШ БЭТА-РАНГ У ГАЛАВУ?


ТЫ ТРЫМАЕШ ПУЛЬТ. Я ВАРУХНУСЯ, І ТЫ ПАЧНЕШ НАПАЎНЯЦЬ РЭЗЭРВУАР АТРУТАЙ. НЯЎЖО НЕ ТАК БЫЛО Ў МІНУЛЫ РАЗ?


О, ТЫ ПАМЯТАЕШ! ТАК МЫ ЗРАБІЛІ ГЭТА Ў МІНУЛЫ РАЗ. ТАДЫ МЫ БЫЛІ СІЛЬНЫМІ І ЭНЭРГІЧНЫМІ! ДВА ДРОБНЫХ БАЛБЕСА.
З-ЗА ЧАГО ГЭТА, ДЖОКЕР? УСЁ ГЭТА?


БАЧЫШ, У ГЭТЫМ УСЯ І СПРАВА. АПОШНІ ЧАС У НАС АДНЫ СПРАВЫ. СПРАВЫ, СПРАВЫ, СПРАВЫ. ТАМУ НА ГЭТЫ РАЗ Я ПАКЛАПАЦІЎСЯ АБА ЎСІМ ГЭТЫМ ЗАГАДЗЯ. КАБ МЫ МАГЛІ ПАСЛАБІЦЦА І СПАКОЙНА ПАБАЛ-БЫТАЦЬ. ТВАР ДА ТВАРУ.


...ДА ТВАРУ (ХІ-ХІ).


ПАКЛАПАЦІЎСЯ АБ ЧЫМ?
НУ, А НАШЫХ СПРАВАХ, КАНЕШНЕ! АБ ТЫМ, ШТО ПАВІННА БЫЛО ЗДАРЫЦЦА ТУТ МІЖ НАМІ.
АБ ЧЫМ ТА ГАВОРЫШ?


ЦІ БАЧЫШ ШТО, У ТОЙ МОМАНТ, КАЛІ ТЫ ПАЧУЕШ ЗВАНОК, ЯКОГА ТЫ ЧАКАЕШ, І КАЛІ ТЫ НЕШТА ВЫРАШЫШ...



...ТЫ ВЫРАШЫШ ЗРАБІЦЬ СВОЙ ХОД, ТАК ЖА? ТЫ КІНЕШ ТОЙ БЭТАРАНГ З-ЗА СВАЁЙ СПІНЫ, ПРАМА ЯЕ Ў МІНУЛЫ РАЗ?


І БАМ! Я ЗАБІТЫ. АЎЎЎЎЎ! АЛЕ ТАМУ, ШТО Я ХУТКІ, ХУУУУТКІ, Я ЦІСКАЮ НА ПУЛЬТ! І АТРУЧВАЮ ВОДУ! І ТЫ ЗВАНІШ СВАЙМУ СЯБРУ, ЯКІ РАНЕЙ БЫЎ РОБІНАМ... НАЙТВІНГ, ТАК?..


«...І ЁН ВЫБУХАЕ АКВЕДУК».
БЭТМЭН, Я ПАДЫХОДЖУ...
ААХ!
БУУМ


І ТАДЫ МЫ Б'ЕМСЯ, І ТЫ РАТУЕШ ГОРАД, АХ, АХ, АЛЕ Я ЗНОЎ АТРЫМАЮ НЕКАЛЬКІ ЛЮДЗЕЙ, ТУЮ САМУЮ ЖМЕНЬКУ, ЯКУЮ АТРЫМАЎ У МІНУЛЫ ЧАС, ТЫХ, ХТО АТРЫМЛІВАЕ СВАЮ ВОДУ РАНЕЙ, ЧЫМ ЯНА ТРАПЛЯЕ Ў ГАРАДСКІ ВАДАПРАВОД.
ПАЦЕШНА, ТЫ ВЕДАЕШ, ШТО ЯНЫ ЗНЕСЛІ МУНІЦЫПАЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁ, ЯКОЕ БЫЛО ТАМ У МІНУЛЫ ЧАС, І ЗАМЕСТ ГЭТАГА ПАБУДАВАЛІ КАНДАМІНІЎМ ДЛЯ МАЛАДЫХ І САМАЎПЭЎНЕНЫХ? І ПАКОЛЬКІ – ТЫЯ, КАГО Я ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ АТРЫМАЮ, Я ПРОСТА ПАЙШОЎ І, НУ... УЗЯЎ ІХ.
ДЖО


ГЛЯДЗІ!
...


БАЧЫШ, УСЁ ЎЖО ЗРОБЛЕНА! ВАДА АТРУЧАНА. АКВЕДУК ВЫБУХНУТЫ. ЛЮДЗІ ПАМЁРЛІ! ЦЯПЕР МЫ МОЖАМ ПАГАВАРЫЦЬ!
ТЫ ХВОРЫ МАНЬЯК!


НУ-НУ, БЭТСССС! Я Ж СКАЗАЎ, ШТО ПРЫЙШОЎ ПАГАВАРЫЦЬ!









БАЧЫШ, ЦЯПЕР МЫ МОЖАМ ПА-БАЛБЫТАЦЬ. МОЙ КАРОЛЬ І Я.
ДЛЯ МЯНЕ ТЫ ТОЛЬКІ...
ШШШ. НЕ РАБІ ГЭТАГА. НЕ ПРЫКІДВАЙСЯ. НЕ ТУТ. НЕ ПЕРАДА МНОЮ., ТВАІМ ПРЫДВОРНЫМ ШУТОМ. А ШТО РАБІЦЬ ШУТУ, ЯК НЕ ПАВЕДАМЛЯЦЬ КАРАЛЮ НАВІНУ? АСАБЛІВА ДРЭННЫЯ НАВІНЫ. НАЙГОРШЫЯ! УСЕ КАРАБЛІ ВА ФЛОЦЕ З ДЗІРАМІ. У АРМІІ АДНІ ПАЦЫФІСТЫ! РУЧКІ ДЗЕТАК ЗГНІЛІ, І ЯНЫ НЕ МОГУЦЬ ПЛЯСКАЦЬ ФЕЯМ!

БО БЛАЗАН – АДЗІНЫ, АД КАГО ЁН ГЭТА НЕ ПАЧУЕ, АДЗІНЫ, ХТО МОЖА ПРЫМУСІЦЬ ЯГО СМЯЯЦЦА З ГЭТАГА, З СЯБЕ. ГЭТА Я І СПРАБУЮ ЗРАБІЦЬ ДЛЯ ЦЯБЕ, БЭТС, ПАВЕДАМІЦЬ САМЫЯ НЕПРЫЕМНЫЯ ТВАЙМУ СЭРЦУ НАВІНЫ, НЕПАСРЭДНА ТАБЕ. І, КАНЕШНЕ, У МЯНЕ ЁСЦЬ НЕШТА ДЛЯ ЦЯБЕ НА ГЭТУЮ НОЧ.





...ТАМУ ШТО Я ВЕДАЮ, ХТО ВЫ!
УСЕ ВЫ, БЭТМЭН І КАМПАНІЯ, ПАД ВАШЫМІ МАЛЕНЬКІМІ МАССССКАМІ! МЕНАВІТА ТАК. Я ВЕДАЮ ВАШЫЯ МАЛЕНЬКІЯ ТАЯМНІЧЫЙ АСОБЫ! Я ВЕДАЮ ВАШЫЯ ІМЕНЫ, ВЫШЫЯ АДРАСЫ... ЧОРТ, НАВАТ ЯКІМ МЫЛАМ КОЖНЫ З ВАС КАРЫСТУЕЦЦА Ў ДУШЫ (І ЧАМУ ТЫ ТАК ЗАЎСЁДЫ ДОБРА ПАХНЕШ, НАЙТВІНГ!).
І ЗАРАЗ Я ВЕДАЮ, ХТО ВЫ ЎСЕ, ВЕДАЮ, ХТО ВЫ НА САМОЙ СПРАВЕ. ПАВІНЕН СКАЗАЦЬ...
...ВЫ ТА ЯШЧЭ КУПКА ***! ХАХАХАХАА!

ВЫ ЖУЛІКІ. САМАЗВАНЦЫ. ШАРЛАТАНЫ.

ЯК ГОРДАН, ТВОЙ СЯБАР ГОРДАН. ЁН ЗДАЕЦЦА МОЦНЫМ, АЛЕ ГЛЫБОКА ЎНУТРЫ, НЕ, НЕ, НЕ. ЁН КРЫВАСМОК, РАЗУМЕЕШ? ЁН СМОКЧА КРОЎ ВА ЎСІХ, У ГОРАДА, У СВАІХ ЛЮДЗЕЙ, У СВАЁЙ ДАЧКІ... ПАРАЗІТ НЯШЧАСНЫ. ШАРЛАТАН.

ЗАРАЗ Я ПРОСТА ГУЛЯЎ З ІМ, АЛЕ ВЫ ЎСЕ, Я ПРЫЙДУ ЗА ВАМІ, АДНІМ ЗА АДНІМ, ХІХІ... БО ВЫ ПА-САПРАЎДНАМУ ДРЭННЫЯ. САПРАЎДНЫЯ ЗЛОДЗЕІ.

ЯКІЯ ПАШКОДЗІЛІ МАЙГО КАШТОЎНАГА КАРАЛЯ. Я КАЖУ, ЗІРНІЦЕ НА ЯГО! ЎЖО НЕ МОЖА ЗЛАВІЦЬ У КЛЕТКУ ПАРУ СТАРЫХ СОЎ БЕЗ ВАШАЙ ДАПАМОГІ.

ЁН ТАКСАМА ГЭТА ВЕДАЕ. ЁН ВЕДАЕ, ШТО ВЫ З ІМ РОБІЦЕ. ТАМУ ЁН ХАВАЕ АД ВАС АДЗІН САКРЭТ. ШТОСЬЦІ ТОЛЬКІ МІЖ МНОЙ І ІМ.

САКРЭТ, ДЗЯКУЮЧЫ ЯКОМУ Я ДАВЕДАЎСЯ ПРА ЎСЁ ГЭТА. ДАВЕДАЎСЯ І ЗАПІСАЎ У ГЭТАЙ КНІЖЦЫ. КНІЖЦЫ, ЗРОБЛЕНАЙ СА СКУРЫ КАЖАНА, З ТОЙ МІЛАЙ ПЯЧОРКІ, У ЯКОЙ ВЫ ЎСЕ ХАВАЕЦЕСЯ.

ТЫ ІЛЖЭШ.

«О, САПРАЎДЫ? ШТО Ж, ДУМАЮ, МЫ ГЭТА ПАБАЧЫМ, ЦІ НЕ ТАК? АЛЕ Я СКАЖУ ВАМ ГЭТА, МАЛЕНЬКІЯ КАЖАНЧЫКІ ДЫ ПТУШАЧКІ... ПРАЗ СЕМДЗЕСЯТ ДВЕ ГАДЗІНЫ ВЫ ЎСЕ БУДЗЕЦЕ МЁРТВЫЯ».

«І ВОСЬ У ЧЫМ СОЛЬ... БЭТМЭН БУДЗЕ ТЫМ, ХТО ЗАБ'Е ВАС!»

ДАЛЕЙ: ДЖОКЕР ПЕРАХОДЗІЦЬ ДА АСОБАЎ

ЛЮДЗІ, ПЕРАД ЯКІМІ СХІЛЯЮЦЦА

З УДЗЕЛАМ ДЖОКЕРА І ПІНГВІНА

SCOTT SNYDER & JAMES TYNION IV *WRITERS*
JOCK *ARTWORK*
DAVE BARON *COLORS*
SAL CIPRIANO *LETTERS*
KATIE KUBERT *ASSISTANT EDITOR*
MIKE MARTS *EDITOR*

ШТО ГЭТА ЗА МЕСЦА ДЛЯ СУСТРЭЧЫ, БОС?

ЗА МЯЖОЙ ГОРАДА, ДАЛЕЙ АД ДАПЫТЛІВЫХ ВАЧЭЙ І ІДЫЁТАЎ У ГАРНІТУРАХ...








ЯНЫ... ЯНЫ ЎСЕ ПАМЕРЛІ, МІСТАР КОБЛПОТ!
Я ГЭТА І САМ БАЧУ, ПУСТА-ЗВОН. ХУТКА ЎСЁ АБШУКАЙЦЕ! ЗНАЙ-ДЗІЦЕ ТАГО, ХТО ГЭТА ЗРАБІЎ!


ГЭТА НАЙБУЙНЕЙШЫЯ КІРАЎНІКІ ЎСІХ ЗЛАЧЫННЫХ СЯМЕЙ ГОТЭМА.
ХМ. ВІДАЦЬ, Я ПАТРАПІЎ У БЯДУ.


ООООО, ТАК.


ХЕК!
МОЦНА ТРАПІЎ.

АЎГІ, НЕ!

БАМ

ШЛЁП



ТЫ ПАВІНЕН БЫЎ ДАЎНО ЎЖО МНЕ РАСКАЗАЦЬ, ЯК ГЭТА ПАЦЕШНА ЗАБІВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ ПАРАСОНАМ!

ДЗЯКУЮЧЫ ЯМУ ЗАБІВАЦЬ УСІХ ГЭТЫХ ЛЮДЗЕЙ БЫЛО НЕ ТАК СУУУУМНА...

БУДЗЕ АСАБЛІВА ПАЦЕШНА, КАЛІ ЎСЕ ІХ БОСЫ ДАВЕДАЮЦЦА, ЯК ЯНЫ ПАМЕРЛІ!

БОЖА, НАВАТ НЯ ВЕДАЮ, ХТО Б МОГ ГЭТА ЗРАБІЦЬ? У ЯКОГА КАНКУРЫРУЮЧАГА ЗЛАЧЫННАГА БОСА ЁСЦЬ ЦЭЛЫ НАБОР СМЕРТАНОСНЫХ ПАРАСОНАЎ!

ХАХАХАХААА

ГЭТА ПРЫВЯДЗЕ ДА САПРАЎДНАЙ ВАЙНЫ, ДЖОКЕР. ТЫ ХОЦЬ УЯЎЛЯЕШ, ШТО ГЭТА МОЖА МНЕ КАШТАВАЦЬ?

ООО, ОЗІ, НЕ ГУБЛЯЙ ГАЛАВУ! Я ТОЛЬКІ СПРАБУЮ ТАБЕ ДАПАМАГЦІ!

ГЭТЫЯ ЛАПУХІ? ЯНЫ ЖУЛІКІ, ОЗІ. ЯНЫ НЕ БАЧАЦЬ ГЭТЫ ГОРАД, ЯК ТЫ ДЫ Я. ЯНЫ НЕ ВЕДАЮЦЬ, ЧАМУ ТОЕ, ШТО ЯНЫ РОБЯЦЬ, САПРАЎДЫ ВАЖНА.

Я Б НЕ ПАДУМАЎ, ШТО ТЫ НАОГУЛ ЗАДУМВАЕШСЯ ПРА АРГАНІЗАВАНУЮ ЗЛАЧЫННАСЦЬ.

О, НЕ ЗАДУМВАЮСЯ. НЕ ЗУСІМ. АСАБІСТА Я ЛІЧУ, ШТО АРГАНІЗАЦЫЯ АБМЯЖОЎВАЕ ЗЛАЧЫНСВЫ ЎСЯЛЯКАГА ПАЦЕШША!

АЛЕ Ў ЯГО КАРАЛЕЎСТВЕ... ГЭТА АБАВЯЗКОВАЕ ТАЎРО ЗЛА. І ТЫ РОБІШ ГЭТА ЛЕПШ ЗА ЎСІХ.

ТЫ ВЕДАЕШ, ШТО ГЭТА ЎСЁ ДЗЕЛЯ ЯГО.

ГЭТЫЯ ДРОБЯЗНЫЯ ЗЛОДЗЕІ, РАБАЎНІКІ, ЗАБОЙЦЫ ДЫ ГАНДЛЯРЫ НАРКОТЫКАМІ... ЯНЫ СІЛКУЮЦЬ ЯГО. ЯНЫ ДАЮЦЬ ЯМУ МЭТУ.

ЯНЫ СХІЛЯЮЦЦА ПЕРАД КАЖАНОМ І БАЯЦЦА ЯГО, БЫЦЦАМ ЁН САМ БОГ.

ТАМУ ШТО ГЭТА ЯНО І ЁСЦЬ, ОЗІ! СХІЛЕННЕ. ЗЛАЧЫНАСЦЬ - ГЭТА РЭЛІГІЯ, ЯКАЯ ПАДТРЫМЛІВАЕ ЯГО ГОРАД!

І ТЫ ТРЫМАЕШ ІХ У СТРАХЕ, ТЫ ПАДТРЫМЛІВАЕШ ЯГО СІЛУ...

ТЫ БІСКУП У ЯГО ЦЁМНЫМ КАРАЛЕЎСТВЕ І ТЫ ЛЕПШ УСІХ ВЕДАЕШ, ЯК КІРАВАЦЬ ЯГО ВЕРНІКАМІ.

ДЫК КІРУЙ ІМІ, ОЗІ!

Я ЎЖО ЗРАБІЎ ПЕРШЫЯ КРОКІ! ЦЯПЕР ТАБЕ ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ ЗНІШЧЫЦЬ АСТАТНІХ І КІРАВАЦЬ ГЭТЫМ ГОРАДАМ, ЯК ТЫ ЗАЎСЁДЫ ЖАДАЎ.

КАЛІ Я БІСКУП, ТАДЫ ХТО ТЫ? АНТЫХРЫСТ?

ХАХАХАХА! НАКОНТ ГЭТАГА, ШТО, КАЛІ Я ДАМ ТАБЕ НЕВЯЛІКІ ВЫБАР. ДАВАЙ СКАЖАМ, ШТО Я Ў АДКАЗЕ ЗА ЎСЮ ГЭТУЮ БРУДКУЮ СЦЭНУ.

ЧОРТ, Я НАВАТ ВЫЛІЖУ ТЫЯ КРЫВАВЫЯ ПАРАСОНЫ, КАБ ДНК УКАЗВАЛА ПРАМА НА МЯНЕ.

ДАЗВОЛЬ Я ЗДАГАДАЮСЯ. НАЎЗАМЕН ПАСЛУГІ... ШТО НА ГЭТЫ РАЗ, ДЖОКЕР? ГАРМАТЫ? БОМБЫ? УСЕ ТЫЯ РЭДКІЯ ХІМІКАТЫ, ЯКІЯ ПАТРЭБНЫ ТАБЕ ДЛЯ ТВАЙГО ГАЗА?

О НЕ, ОЗІ... НІЧОГА ТАКОГА.

Я ТОЛЬКІ РЫХТУЮ НЕЙКУЮ ПРЫВАТНУЮ ВЕЧАРЫНУ, РАЗУМЕЕШ... І Я ХАЦЕЎ ДАСЛАЦЬ ЗАПРАШЭННІ.

А КАЛІ Я АДМАЎЛЮСЯ?

ЗБІРАЙ ДУБОЎ, СТАРЫНА! БЫ БУДЗЕМ ВАЯВАЦЬ!

ХАХАХАХААА

ДОБРА, ДЖОКЕР... Я СЛУХАЮ.

ПРАЦЯГ БУДЗЕ...